УДК 398.32(476)

В. С. Новак

# Міфалогія жыллёвай прасторы беларусаў

У артыкуле на багатым аўтэнтычным матэрыяле раскрываецца семантыка асобных элементаў жыллёвай канструкцыі беларусаў, вызначаецца іх сімвалічная функцыя.

Праз прызму прыкмет і павер’яў, звязаных з жыллём і яго элементамі, можна даследаваць няпросты свет духоўнага жыцця нашых продкаў, асэнсоўваць глыбіню іх мыслення, спасцігаць сутнасць гарманічных стасункаў паміж прыродай і чалавекам, які спрадвеку імкнуўся суадносіць сваё жыццё з космасам, зямлёй і небам. З хатай як сімвалічнай мадэллю светабудовы ў традыцыйнай культуры беларусаў былі звязаны як язычніцкія, так і хрысціянскія ўяўленні. Засяродзім увагу на семантыцы асобных элементаў жыллёвай прасторы беларусаў.

Стол – сакральны цэнтр хаты, «адзін з найбольш рытуалізаваных і шанаваных прадметаў у традыцыйнай культуры» [1, с.489]. На пытанне, дзе звычайна знаходзіўся ў хаце стол, жыхарка в. Капань Рэчыцкага раёна адказала: «Стол ставяць каля кута, гэта свяшчэннае месца пад абразамі. Паеў і памаліўся Богу» (Запісана ад Зуевіч Наталлі Мікалаеўны, 1938 г.н.). «Замацаванасць стала ў пярэднім куце, у непасрэднай блізкасці ад бажніцы з абразамі, свечкамі, асвечанай вярбой і іншымі хрысціянскімі атрыбутамі, у найбольш асвечанай частцы жылля, надзяляла стол высокім статусам. Стол паўставаў як месца сімвалічнага абмену паміж Богам, які назіраў за людзьмі з абразоў, і людзьмі, якія спажывалі страву, пасланую Богам [2, с. 166]. Стуканне па стале асэнсоўвалася жыхарамі Рэчыцкага раёна як знявага ў дачыненні да Бога: «Па сталу нельга было біць ці стукаць, бо ты падымаў руку на самаго Бога» (запісана ў в. Капань ад Зуевіч Наталлі Мікалаеўны, 1938 г.н.). «На Рускай Поўначы не дазвалялася стукаць па стале, бо стол – гэта далонь Бога або Богамацеры, працягнутая людзям» [2, с. 167].

У шматлікіх прыкметах і павер’ях гаворыцца пра такі важны атрыбут, які заўсёды павінен быць на стале, як хлеб, што звычайна клалі на абрус, якім быў засцелены стол: «Стол усягда быў засланы скацерцю. На ёй стаяла соль і ляжаў хлеб, штоб быў дастатак у хаце» (запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.). «Пастаяннае знаходжанне хлеба на стале павінна было забяспечыць дастатак і дабрабыт дома» [2, с. 167].

Забаранялася ў народзе выкідаць хлеб, які ўпаў са стала на падлогу. Лічылі, што калі так зрабіць, то Бог таго пакарае: «Калі ж са стала падаў хлеб, то яго нельга было выкідаць. Трэба было падняць, пацалаваць і з’есці, каб Бог не пакараў» (запісана ў в. Капань Рэчыцкага раёна ад Зуевіч Наталлі Мікалаеўны, 1938 г.н.). «Стол у сялянскім побыце, па-першае, з’яўляўся сімвалічным цэнтрам рэчавага свету хаты, усёй унутранай прасторы жылля, па-другое, меў сімвалічную сувязь з небам, і па-трэцяе, у прасторы рэчавага свету хаты выконваў сімвалічную ролю Зямлі» [3, с. 36].

Што датычыць апошняга сімвалічнага значэння стала як зямлі, то невыпадковымі з’яўляюцца павер’і пра грошы, якія выступаюць у якасці своеасаблівага ахвярапрынашэння. Напрыклад, жыхары в. Баравое Лельчыцкага раёна лічылі, што грошы «трэба класці на стол на скацерць, каб яны вадзіліся» (запісана ад Буцькавец Марыі Ісакаўны, 1932 г.н.). У гэтых адносінах, паводле народных вераванняў, эфектыўнымі з’яўляюцца забароны ставіць на стол пустую бутэльку, а таксама пераварочванне гаспадыняй пустога посуду. «Пустую бутэльку на стол не стаў – грошай не будзе. Па гэтай прычыне гаспадыня пераварочвае посуд да верху, калі ён пусты» (запісана ў в. Судавіца Светлагорскага раёна ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1962 г.н.). На адсутнасць грошай указвала наступнае павер’е, якое было

звязана з прыбіраннем са стала рэшткаў ежы: «Са стала нельга было смятаць рукамі, бо лічылася, што ў хаце не будзе грошай» (запісана ў г. Светлагорску ад Мацкевіч Ганны Фролаўны).

«Стол у хаце лічыўся амаль што свяшчэнным, бо думалі, што праз стол, які ставіўся ў чырвоны кут пад абразы, наладжваецца сувязь з Богам, з небам» [3, с. 34]. Невыпадкова святасць стала як цэнтра хаты пацвярджаецца пэўнымі забаронамі. Напрыклад, не дазвалялася класці на стол галаўны ўбор: «Калі мужчына шапку на стале аставіць – напасць будзе. Нельзя і хустку астаўляць» (запісана ў в. Капань Рэчыцкага раёна ад Зуевіч Наталлі Мікалаеўны, 1938 г.н.), садзіцца на стол («Нельзя на стол садзіцца: маладзіца дзіця не ўбачыць, мужык памрэ» – запісана ў в. Варатын Калінкавіцкага раёна ад Асацкай Марыі Савельеўны, 1937 г.н.), «нельга сядзець на ім, хвароба будзе» (запісана ў в. Чыркавічы Светлагорскага раёна ад Мартынчык Тамары Аляксандраўны, 1935 г.н.). Стол параўноўваўся з алтаром, адсюль вынікала матывацыя забароны пускаць кошку або іншых жывёл поўзаць па стале («Не дазвалялі кату, сабаку і іншай жывёле лазіць па сталу, бо гэта азначае, што алтар асквярняецца, забруджваецца» – запісана ў в. Капань Рэчыцкага раёна ад Зуевіч Наталлі Мікалаеўны, 1938 г.н.).

Асцерагаліся пакідаць на стале нож і крошкі: «Нельзя штоб былі крошкі на стале, ляжаў нож» (запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.). Верылі, што пакінуты на стале нож можа справакаваць сварку ў сям'і: «Нельзя пакідаць на стале нож – будзе ссора ў хаце».

Паводле народных вераванняў, стол «лічыўся святыняй, крыніцай здароўя» (запісана ў г. Рэчыца ад Чыжык Таісіі Іванаўны, 1939 г.н.). Мясцовыя жыхары выконвалі адно з важнейшых патрабаванняў, якое было звязана з захаваннем чысціні стала: «Нада каб стол заўсёды чысты быў, і нічога не астаўляць на ім» (запісана ў в. Варатын Калінкавіцкага раёна ад Асацкай Марыі Савельеўны, 1931 г.н.). Чысціню стала звязвалі і з ушанаваннем памерлых: «Стол усягда доўжан быць чыстым, бо за ім збіраецца ўся сям'я, і дажа тыя, хто памерлі» (запісана ў в. Крынкі Рэчыцкага раёна ад Краўчанка Надзеі Рыгораўны, 1940 г.н.).

Стол – той прадметны аб'ект, якому надавалася важнае значэнне пры выкананні вясельных і каляндарных абрадаў. Напрыклад, у в. Судавіца Светлагорскага раёна «маладых у час вяселля абводзяць тры разы вакол стала – на шчасце. Абводзячы маладых вакол стала, ім жадаюць, каб яны таксама былі разам заўсёды» (запісана ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1962 г.н.).

Падлога – ніжняя частка прасторы жылога памяшкання, супрацьлеглая страсе. «І калі гарышча ў структуры будовы хаты, як мы казалі, у народным усведамленні ў мінулым уяўляла «нябесную сферу», то падлога збліжалася з урадлівай глебай, нівай» [3, с.21].

Звычайна, калі мылі падлогу, то выкарыстоўвалі палын. Лічылася, што гэта расліна «адганяе духаў. Яшчэ палыннію травілі блох, якія з'яўляліся ад сырасці ў хаце» (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна ад Яськова Аляксея Аляксеевіча). Падобных меркаванняў прытрымліваліся і жыхары в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна: «Штоб не пускаць розных духаў у хату, пол мылі палыннію» (запісана ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.). «Палын, чарнобыльнік, божае дрэва – расліна з горкім смакам і рэзкім пахам, надзяляецца адгоннай і засцерагальнай семантыкай, выкарыстоўваецца для нейтралізацыі нячыстай сілы, а таксама ў лекавых і магічных мэтах; сімвал суму, гора, злосці…» [4, с. 159].

Жыхары в. Судавіца Светлагорскага раёна былі ўпэўнены, што выдатным сродкам пазбаўлення ад хваробы і пакут з'яўляецца «мыццё падлогі салёнай вадой» (запісана ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1962 г.н.). Ваду, якой мылі падлогу, лічылі шкоднай і імкнуліся выліць у якое-небудзь месца, дзе «ніхто не хадзіў, каб ніхто не мог зрабіць для дома нічога плахога» (запісана ў г. Гомель ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.).

Важным элементам жыллёвай прасторы з'яўляецца покуць, з якой былі звязаны і гаспадарчыя, і сямейныя абрады. «З покуццю звязвалі ў хаце ўсё добрае. На Каляды тут вешалі саламянага «павука» – прыгожы старажытны сімвал сонца, які, па павер'ях, прыносіў шчасце…З покуццю звязваліся ўсе асноўныя падзеі ў жыцці чалавека – ад нараджэння да

пахавання. Перад хрышчэннем кума па традыцыі клала немаўлятка – і менавіта хлопчыка, а не дзяўчынку – у чырвоны кут, на гаспадарчае «месца». На покуці ж знаходзіў чалавек і апошні прытулак у хаце: тут пад абразамі ставілі труну з нябожчыкам» [3, с. 17].

Уяўленні пра покуць звязаны са светам памерлых, зыходзячы з успамінаў Аляксея Аляксеевіча Яськова з в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна: «звычайна асацыяцыі складваюцца з пакойнікам. Пакойніка клалі галавой да абразоў, нагамі – у дзверы. На стале абавязкова ляжаў хлеб, стаяла соль, стаяў стакан, у якім была свечка і пшано, у якім стаяла свечка». Невыпадкова гаварылі, што «покуць паказвае на святло, усход, божы бок» (запісана ў в. Крынкі Рэчыцкага раёна ад Краўчанка Надзеі Рыгораўны, 1940 г.н.), бо тут «знаходзіліся абразы, малельныя і святыя кнігі. Тут на скрыжаванні лаў, у многіх хатах ставілі хлебную дзяжу як сімвал дастатку і дабрабыту. У час абраду зажынак і дажынак першы і апошні снапы ставілі на пачэснае месца, у чырвоны кут» [3, с. 17].

Каб забяспечыць дабрабыт сям'і, у чырвоным куце «ставілі сноп пшаніцы, каб сям'я не нуждалася ў хлебе» (запісана ў г. Гомель ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н. (раней пражываў у в. Васькавічы Пачэпскага раёна Бранскай вобласці).

Дзверы – элемент жыллёвай канструкцыі, які абазначае мяжу, «забяспечвае сувязь са знешнім светам (адчыненыя дзверы) і засцярогу ад яго (зачыненыя дзверы) [5, с. 25]. «Станоўчая семантыка дзвярэй знаходзіць паралель у яе хрысціянскай трактоўцы як уваходу ў царства нябеснае, у эпітэтах «Дверь Спасення», якія адносяцца да Багародзіцы («Радуйся, двере едина…») або Хрыста («единая Дверь Спасення»), а таксама ў адпаведным афармленні Царскіх варот у храме» [5, с. 25].

Паводле павер'яў, распаўсюджанымі апатрапеямі, якія звычайна маляваліся на дзвярах, з'ўляліся хрысціянскія сімвалы, напрыклад, крыж: «Над дзвярыма вешалі крыж, каб злыя духі не прайшлі ў хату. Крыж абараняў хату ад злых духаў» (запісана ў г. Светлагорск ад Мацкевіч Ганны Фролаўны); «Над дзвярыма малявалі крыж, каб злыя духі не змаглі зайсці ў хату» (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна ад Яськова Аляксея Аляксеевіча). «У вярху дзвярэй выпалівалі крэст для таго, штоб душы пакойнікаў не хадзілі ў хату» (запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.).

У якасці прадметаў-абярэгаў ад звышнатуральнага ўздзеяння нячыстай сілы выкарыстоўвалі расліны («На дзверы вешалі чартапалох і часнок, каб нячыстая сіла абышла гэту хату» – запісана ў в. Азершчына Рэчыцкага раёна ад Цуранковай Соф'і Кандратаўны, 1944 г.н.), венік («Для пазбаўлення ад нечысцей на ноч ля дзвярэй ставілі перавернутую мятлу» (запісана ў в. Крынкі Рэчыцкага раёна ад Краўчанка Надзеі Рыгораўны, 1940 г.н.); шпільку ці іголку («Каб зберагчы хату ад злых духаў і нячыстай сілы трэба ўваткнуць у дзверы булаўку ці іголку вострай стараной наружу» (запісана ў г. Светлагорск ад Мацкевіч Ганны Фролаўны), іголку з ніткай («Каб хату засцерагчы ад злога вока, трэба ўваткнуць над дзвярыма іголку з ніткай» (запісана ў в. Судавіца Светлагорскага раёна ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1962 г.н.).

Для забеспячэння сямейнага шчасця над дзвярыма прымацоўвалі падкову: «Над дзвярамі вешалі падкову для таго, каб было ў доме шчасце» (запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.). Аналагічных вераванняў прытрымліваліся і жыхары в. Купаўцы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці: «Над дзвярыма вешалі падкову на шчасце» (запісана ад Баўкуновіч Сцепаніды Несцераўны, 1938 г.н.).

Варта адзначыць, што ў традыцыйнай культуры беларусаў як асобныя часткі дзвярэй, так і ў цэлым дзверы асэнсоўваліся як аб'ект ахоўнай магіі [5, с. 27]. Як адзначылі інфарманты, «зачыненыя дзверы ахоўвалі хату ад знешняга ўмяшацельства» (запісана ў в. Залессе Рэчыцкага раёна ад Загорцавай Еўдакіі, 1941 г.н.). Паколькі зачыненыя дзверы выступалі як апатрапей, то іх скрып успрымалі як «нейкае папярэджанне»: Дзверы пачыналі рыпець – хутка няшчасце» (запісана ў в. Судавіца Светлагорскага раёна ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1962 г.н.). Устойлівым на тэрыторыі Гомельскага Палесся з'ўляецца павер'е, паводле якога забаранялася размаўляць або перадаваць што-небудзь у становішчы праз

дзверы: «Праз дзверы нельзя разгаварываць і перадаваць вешчы, штоб не паругацца» (запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.). Народнай традыцыяй забаранялася «спаць нагамі да дзвярэй – раней памрэш» (запісана ў г. Гомель ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.).

У радзінна-хрэсьбіннай абраднасці дзверы выступалі як магічны сродак аблягчэння родаў жанчыны-парадзіхі: «Калі жанчына ражала, то ў хаце адкрываліcь дзверы, окна, шкафы…» (запісана ў г. Гомель ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.). У такім жа адчыненым становішчы знаходзіліся дзверы ў памінальныя дні: іх «адкрывалі або астаўлялі незапёртымі, каб душы памерлых маглі прыйсці на сямейны ўжын» (запісана ў г. Гомель ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.).

Акно як важны сакральны элемент жыллёвай канструкцыі «суадносіцца з ідэяй уваходу, пранікальнасці, сувязі жылля з вонкавым светам. Акно звязвае жыллё не проста з астатнім светам, а са светам касмічных з'яў і працэсаў ( з сонцам, месяцам, бакамі свету)» [1, с. 21]. Паводле сведчанняў Валерыя Дзмітрыевіча Шахлана з в. Судавіца Светлагорскага раёна, акно «з'яўлялася тунэлем сувязі паміж жывучымі і памерлымі». Невыпадкова ў мінулым менавіта праз «вакно выносілі гроб» (запісана ў в. Судавіца Светлагорскага раёна). Той факт, што «акно выходзіла на божую старану (усход ці поўдзень – В.С. Новак) і ажыццяўляла сувязь жылля з сонцам, ва ўяўленні беларусаў мінулага азначала святасць і самаго акна» [3, с. 27].

Каб засцерагчыся ад маланкі, на падаконнік «ставілі свянцоныя кляновыя дубцы» (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна ад Яськова Аляксея Аляксеевіча). У в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна таксама «на вокны ставілі свячоную ваду, дубчыкі вярбы, каб маланку не прыцягваць» (запісана ад Тарасевіч Веры Адамаўны, 1940 г.н.).

У народнай традыцыі прынята было, калі «ў сям'і памiралі дзеці, то дзіцёнка, які толькі нарадзіўся, перадаваць праз акно» (запісана ў г. Гомель, ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.). Гэтая прыкмета датычыла і тых выпадкаў, калі хавалі нехрышчоных дзяцей: «Праз акно выносілі нехрышчоных памерлых дзяцей» (запісана ў г. Гомель, ад Гаўрачкова Алега Сяргеевіча, 1941 г.н.).

Звычайна ў становішчы каля акна адбываліся рытуалы варажбы, заклікання марозу (у аснове звароту да яго ляжалі ўяўленні, звязаныя з духамі памерлых) і абрад калядавання (калядоўшчыкі – гэта сімвалічнае ўвасабленне духаў памерлых). «Звычай выканання каляндарных песень пад акном і адорвання рытуальных гасцей праз акно з'яўляецца характэрнай асаблівасцю многіх абходных абрадаў, што адлюстравалася і ў тэрміналогіі калядавання: рус. ходить под окошком; бел. ходити пуд окнами…» [6, с. 535–536].

Вялікім грахом лічылася выкідванне смецця праз акно: «Смецце праз акно нельга выкідваць – гэта вялікі грэх» (запісана ў в. Азершчына Рэчыцкага раёна ад Цуранковай Соф'і Кандратаўны, 1944 г.н.). Забаранялася на досвітку глядзець у акно, лічылася, што «чалавек прыцягвае няшчасце» (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна Яськова Аляксея Аляксеевіча).

Баяліся мясцовыя жыхары, калі «ў вакно на раніцы пастукаў верабей, то гэта да смерці», а таксама забаранялася чалавеку адгукацца: калі «хто-небудзь на рассвеце зваў у акно, і ты адгукнуўся, то гэта хутка да тваёй смерці» (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна Яськова Аляксея Аляксеевіча).

Страха – элемент жыллёвай канструкцыі, які з'яўляецца супрацьлеглым ў адносінах да падлогі. «У сімвалічным плане страха аддзяляе верх (неба) ад свету людзей (сярэдняга свету), так як падлога, зямля, водная прастора аддзяляюць сярэдні свет ад ніжняга» [6, с. 15]. Звычайна пад страхой захоўвалі прылады працы (касу, серп, сякеру), якія «абаранялі хату ад дурнога вока» (запісана ў в. Судавіца Светлагорскага раёна ад Шахлана Валерыя Дзмітрыевіча, 1926 г.н.).

Асэнсаванне страхі як «пакрова Божай Мацяры» – даніна ўплыву хрысціянскай традыцыі на светапогляд жыхароў Рэчыцкага Палесся: «Страха з'яўляецца пакровам Божай Мацяры і аберагае дом, кожнага чалавека ў доме» (запісана ў г. Рэчыца ад Чыжык Таісіі

Іванаўны, 1939 г.н.). Паводле ўспамінаў Аляксея Аляксеевіча Яськова з в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна, каб свойская жывёла не хварэла і вялася на падвор'і, пад страхой захоўвалі конскі хвост («каб скаціне было добра, каб не хварэла і вялася»).

Страха – адзін з аб'ектаў, які моладзь уключала ў рытуалы варажбы: «Напрыклад, на Каляды ці на Шчодры вечар дзяўчаты зубамі выцягвалі саломінкі са страхі: чыя саломінка акажацца даўжэйшая, тая з дзяўчат першая выйдзе замуж, у каго ж саломінка будзе мець колас з зернем, тая выйдзе за багатага, у каго без зерня – за беднага, калі ж саломінка наогул без коласа – ці то зусім застанецца ў дзеўках, ці выйдзе за ўдаўца. А вось у Фаміну нядзелю (першая нядзеля пасля Вялікадня) варажылі па-іншаму: перакідвалі цераз страху велікоднае яйка, і калі яно, упаўшы, разбівалася на кавалкі, лічылі, што ў гэтым годзе нехта ў доме памрэ» [3, с. 20–21].

Асэнсаваныя матэрыялы па семантыцы аб'ектаў жыллёвай прасторы дазваляюць зрабіць высновы аб выкананні імі пэўных сімвалічных функцый, што глыбей раскрывае асаблівасці светапогляду беларусаў. Увогуле назіранні над сімвалічным значэннем аб'ектаў матэрыяльнай мастацкай культуры дапамагаюць выявіць іх сімволіку на ўзроўнях узаемадзеяння з космасам, навакольнай рэчаіснасцю, з грамадствам.

Літаратура

1 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.], склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

2 Славянские древности: Этнолигвистич. словарь в 5-ти томах / Под общей ред Н.И. Толстого. – Т. 5: (Сказка) – Я (Ящерица). – М.: Междунар. отношения, 2012. – 736 с.

3 Ленсу, Я.Ю. Таямніцы беларускай хаты / Я.Ю. Ленсу. – Мінск: Беларусь, 2007. – 167 с.

4 Славянские древности: Этнолингвистич. словарь в 5-ти томах / Под общей ред. Н.И. Толстого. –Т.4: П (Переправа через воду) – С (Сито). – М.: Междунар. отношения, 2009. – 656 с.

5 Славянские древности: Этнолингвистич. словарь в 5-ти томах / Под общей ред. Н.И. Толстого. – Т.2: Д – К(Крошки). – М.: Междунар. отношения, 1999. – 704 с.

6 Славянские древности: Этнолингвистич. словарь в 5-ти томах / Под общей ред. Н.И. Толстого. – Т. 3: К (Круг) – П (Перепелка) – М.: Междунар. отношения, 2004. – 704 с.